# З 15 па 17 мая праходзіць Нацыянальная выстава Беларусі ў Таджыкістане

15 мая адбылося афіцыйнае адкрыццё Нацыянальнай выставы Рэспублікі Беларусь у Таджыкістане. Выставу ў Душанбэ наведалі прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка і прэзідэнт Рэспублікі Таджыкістан Эмамалі Рахмон.

Нацыянальная экспазіцыя дэманструе кіраўнікам дзяржаў і прадстаўнікам дзелавых колаў Таджыкістана, а таксама ўсім наведвальнікам стэнды беларускіх вытворцаў. Прадстаўнікі мясцовага бізнесу на працягу ўсяго часу працы выставы змогуць азнаёміцца з прадукцыяй айчынных вытворцаў, а таксама адкрыць для сябе перспектывы супрацоўніцтва. Такім чынам, Нацыянальная выстава Рэспублікі Беларусь у Таджыкістане стала цэнтрам дзелавых сустрэч і перамоваў.

Нацыянальная выстава Беларусі ў Таджыкістане будзе праходзіць з 15 па 17 мая. Свае падведамныя прадпрыемствы і арганізацыі прадстаўляюць Мінпрам, Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, Міністэрства аховы здароўя, МЗС, Мінадукацыі, Мінсельгасхарч, Міністэрства сувязі і інфарматызацыі, Міністэрства спорту і турызму, ДКНТ, Нацыянальная акадэмія навук, канцэрны «Белдзяржхарчпрам», «Беллеспаперапрам» і «Белнафтахім», абласныя выканаўчыя камітэты, Мінгарвыканкам.

Крыніца: БЕЛТА

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/15-05-2018-3079*